# БЕЛАРУСКАЯ ТЭАТРАЛЬНАЯ АНТРЭПРЫЗА Ў КАНТЭКСЦЕ СІСТЭМЫ «РЭЖЫСЁР – АКЦЁР» (ПА МАТЭРЫЯЛАХ АПЫТАННЯ ЭКСПЕРТАЎ)

**Г.М. Стэльмах**
*старшы выкладчык кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Тэатральная антрэпрыза як сінтэтычнае мастацтва ўбірае ў сябе многія віды творчасці. Працэс стварэння спектакля – выніковага прадукту калектыўнай дзейнасці – увасабляецца шматлікімі ўдзельнікамі пастаноўкі. Непасрэдна тэатральная антрэпрыза звязана з дзейнасцю прадзюсера, які ў сучасным прыватным тэатры мае найважнейшае значэнне. Прадзюсер з'яўляецца асноўным арганізатарам і кіраўніком пастаноўкі, вызначае яе стыль. Мастацкае ўвасабленне драматургічнага матэрыялу звязана з творчасцю рэжысёра і акцёраў. Менавіта ад іх намаганняў залежыць канчатковае гучанне спектакля на сцэнічных падмостках.

Аб'ектам прадстаўленнага даследавання былі беларускія рэжысёры і акцёры тэатральнай антрэпрызы. Анкетнае апытанне (паўторнае) праводзілася ў 2011 г., у ім прынялі ўдзел 8 экспертаў рэжысёраў і 31 эксперт акцёр. Першае апытанне 8 экспертаў рэжысёраў і 32 экспертаў акцёраў было праведзена ў 2006 г. [2, с. 271–277]. У выніку былі атрыманы статыстычныя даныя, якія дазволілі адлюстраваць характар адносін суб'ектаў тэатральнага працэсу да развіцця прыватнай тэатральнай справы на Беларусі за адзначаны перыяд.

Аналіз даных апытання 2011 г. сведчыць пра дынаміку прафесійнага пункта погляду акцёраў і рэжысёраў аб рэальнай дзейнасці тэатра ў сённяшніх сацыяльных умовах. У акцёрскім асяроддзі назіраецца раз-розненнасць меркаванняў аб узроўні задаволеннасці працы ў дзяржаўным тэатры. Адказы рэспандэнтаў прапарцыянальна падзяліліся на тры катэгоры: тых, хто поўнасцю задаволены сваёй творчай рэалізацыяй у рэпертуарным тэатры, часткова задаволены і зусім незадаволены дзейнасцю ў тэатры. «Перамены, якія адбываюцца ў нашым грамадстве і творчым асяроддзі на фоне агульнага зніжэння жыццёвага ўзроўню і рэальнай заработнай працы, у некаторай ступені трансфармавалі вобраз тэатра і ўяўленні пра яго дзейнасць» [1, с. 7].

У той жа час, рэжысёры выяўляюць больш значную паліткарэктнасць у ацэнцы сваёй дзейнасці ў дзяржаўным тэатры. Калі ў 2006 г. толькі чвэрць апытаных рэспандэнтаў лічыла сябе рэалізаванымі ў прафесіі [2, с. 274], то пры паўторным апытанні такой кропкі позірку прытрымлівалася ўжо палова апытаных рэжысёраў і яшчэ чвэрць адзначыла частковую задаволенасць сваёй творчай дзейнасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абгрунтоўваючы прычыны ўдзелу ў прыватных праектах, беларускія акцёры ў першую чаргу вызначаюць магчымасць супрацоўніцтва з новым рэжысёрам (22) і новымі партнёрамі (20). Трэцюю ступеньку рэйтынгу меркаванняў аб прывабнасці тэатральнай антрэпрызы сярод выканальнікаў падзялілі паміж сабой выказванні рэспандэнтаў пра творчую атмасферу ў калектыве і магчымасць атрымання дадатковага заробку ад удзелу ў прыватных пастаноўках (18). У папярэднім даследаванні (2006 г.) фінансавы аспект займаў толькі сёмы радок рэйтынгу, саступіўшы пазіцыі выказванням пра магчымасці атрымаць новую ролю; пра больш поўную рэалізацыю сваіх творчых здольнасцяў у прыватных праектах; пра работу з цікавай драматургіяй [2, с. 274]. Гэта ў пэўнай ступені сведчыць пра сацыяльную неабароненасць беларускіх акцёраў. «Узровень дабрабыту – важны фактар сацыяльнага самаадчування – у акцёрскім асяроддзі вельмі нізкі» [1, с. 10]. Сама жыццёвая сітуацыя і няўпэўненасць у заўтрашнім дні, на думку апытаных, вядзе да пастаяннага пошуку дадатковага прыробку.

Карэннае адрозненне антрэпрызы ад дзяржаўнага тэатра акцёры бачаць у творчай свабодзе, якая праяўляецца ў індывідуальным падыходзе пры прызначэнні на ролі, у большай плотнасці і прадуктыўнасці пад час работы над спектаклем, у своеасаблівай атмасферы, больш «трапяткіх адносінах» адзін да аднаго, у «праве слова», у розніцы таленту кіраўніка. «Антрэпрыза – гэта свабода выбару», – адказ аднаго з рэспандэнтаў, тыповы для большасці апытаных. Паказальна, што 24 акцёры назвалі ролі, сыграныя у спектаклях прыватных праектаў, сваім творчым поспехам.

Аднак, пры станоўчых адказах паловы рэспандэнтаў на пытанне «Ці ёсць роля, якую Вы марыце выканаць?», толькі пятая частка (6) ад агульнага масіву апытаных акцёраў падкрэсліла, што падобная рэалізацыя магчыма толькі ў межах антрэпрызы. Яшчэ менш (4) лічаць, што такі шанец ім падасца ў дзяржаўным тэатры. Вынікі большасці анкетаваных былі вельмі размытымі. Для 12 выканаўцаў уласнік пляцоўкі значэння не мае, а яшчэ 9 акцёраў увогуле ўскладніліся з адказам ці не лічаць магчымым па нейкіх прычынах сыграць запаветную ролю.

Цікава, што нягледзячы на праблемы, якія існуюць у выканаўцаў у дзяржаўных тэатрах, у акцёрскім асяроддзі не назіраецца ўстойлівых меркаванняў адносна ўмоў, пры якіх апошнія сталі бы пастаяннымі супрацоўнікамі прыватнага тэатра. Па даных даследавання, толькі чвэрць апытаных гатовыя змяніць падмосткі дзяржаўнай сцэны на прыватную пры ўмовах высокага заробку. Чвэрць рэспандэнтаў увогуле ні пры якіх абставінах не жадаюць пакідаць сваё асноўнае месца работы. Рэальныя, хоць бы невялікія гарантыі, якія дае акцёрам дзяржаўны тэатр, перавешваюць самыя смелыя прадзюсерскія праекты. Па прычыне спарадычнасці паказаў прыватных спектакляў і залежнасці іх рэнтабельнасці ад глядацкага попыту.

Даныя даследавання паказалі, што меркаванні беларускіх рэжысёраў адносна прывабнасці прыватных праектаў за апошнія пяць гадоў таксама прыцярпелі некаторых змяненняў. У 2006 г. пераважная большасць дзеячоў сцэны бачыла антрэпрызу месцам рэалізацыі сваіх творчых задум, у тым ліку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і праз свабоду выбару выканальніцкага складу (два самыя папулярныя меркаванні) [2, с. 274]. Цяперашняе апытанне паказала, што толькі палова рэспандэнтаў прытрымліваюцца меркавання адносна магчымасці самарэалізацыі ў прыватных праектах. Яшчэ палова апытаных выказала думку аб здзяйсненні пошукавай дзейнасці ў межах антрэпрызы. Такія вынікі з'яўляюцца паказчыкам змяншэння дамінавання персоны рэжысёра і рэальнага ўзрастання ролі прадзюсера пры рэалізацыі прыватнага праекта. Таму што творча-вытворвыя рашэнні апошняга з'яўляецца ключавымі ў момант запуску спектакля ў пракат.

Адсюль і зусім невыпадковым з'яўляецца цяперашні вынік адказа рэжысёраў на пытанне «Чым абумоўлены выбар той ці іншай п'есы да пастаноўкі ў прыватным праекце?» Палова рэспандэнтаў адзначыла, што драматургічны матэрыял падбіраецца зыходзячы з унутраных перакананняў прадзюсера, злучаных з мяркуемымі чаканнямі глядацкай аўдыторыі. У 2006 г. самым папулярным быў адказ «актуальнасць матэрыялу», яго прытрымлівалася палова рэжысёраў.

Апытанне экспертаў паказала, што за апошнюю пяцігодку сітуацыя вакол прыватных тэатраў карэнным чынам не змянілася. Найболей сур'ёзнымі прычынамі, якія тармозяць развіццё прыватнай тэатральнай ініцыятывы, па ранейшым з'яўляюцца, на думку рэжысёраў, адсутнасць увагі і цікавасці да антрэпрызы з боку дзяржаўных органаў кіравання культурнай дзейнасцю, слаба развітая спонсарская падтрымка, недахоп фінансава даступных тэатральных пляцовак і неадпаведнасць існуючых нарматыўных актаў і дакументаў, якія рэгулююць прыватную тэатральную справу, рэаліям часу.

Праблема несфарміраванасці грамадскай думкі пра тэатральную антрэпрызу, негарантаванасць дзяржаўнага патранажу сталі вынікам таго, што рэспандэнты кардынальна змянілі свае прагнозы адносна будучыні прыватных тэатраў у Рэспубліцы Беларусь. Кожны другі апытаны рэжысёр у 2006 г. ускладаў свае надзеі на магчымасць развіцця прыватнай тэатральнай ініцыятывы. У 2011 г. палова анкетаваных бачыць будучыню прыватных тэатраў вельмі нявызначанай ці такой жа складанай як і сёння. І толькі чвэрць рэспандэнтаў вераць у магчымасць існавання альтэрнатыўнага недзяржаўнага тэатральнага сектара.

Даныя апытання экспертаў сведчасць, што адносіны дзеячоў сцэны да тэатральнай антрэпрызы за апошнія пяць гадоў прыцярпелі некаторыя змяненні. Вынікі экспертных ацэнак носяць падчас супярэчлівы характар. У сваіх крайніх праявах яны дэманструюць пазітыўны ўплыў антрэпрызы на раскрыццё творчага патэнцыялу акцёраў і правядзенне пошукавай работы у межах рэжысёрскай канцэпцыі спектакля. Адваротная дынаміка у меркаваннях экспертаў назіраецца ў песімістычных прагнозах перспектыў развіцця прыватнай тэатральнай справы. Адсутнасць выразна пазначаных дзяржавай стратэгій развіцця ўсяго беларускага сцэнічнага мастацтва, робіць бессэнсоўнымі і неэфектыўнымі спробы тэатральнай антрэпрызы фарміравання сваёй аўдыторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Іўчанка, В.М.* Акцёр і тэатр : акцёрская прафесія ў кантэксце сістэмы ўзаемадзеяння суб'ектаў тэатральнага працэсу (Па матэрыялах сацыялагічнага даследавання ) / В.М. Іўчанка // Аператыўная інфармацыя по праблемах культуры і мастацтва / Нац. бібліятэка Беларусі ; адк. за вып. Л.В. Гарбачова. – Мінск , 2001. – Вып. 1. – С. 5–12.
2. *Стельмах, А.М.* Роль национальной театральной антрепризы в современном культурном процессе (по материалам социологического исследования) / А.М. Стельмах // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : у 2 ч. / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск, 2007. – Ч. 2 : Праблемы тэатральнага, музычнага і кінатэлемастацтва ў кантэксте славянскіх культур у сучасным свеце. – С. 271–277.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ